Александр Татаренко, *Недозволенная память: Западная Беларусь в документах и фактах: 1921-1954*, Санкт-Петербург, «Архив АТ», 2006, 808 с., [12] с.: ил.

История всегда, к сожалению, являлась наукой ангажированной — не просто социально, но прежде всего социально-политически, особенно новейший ее период. Страницы истории первой половины XX века с самого начала ее исследований неоднократно переписывались под диктовку разного рода конъюнктуры. А она не благоволила к белорусскому народу. Поэтому он так пока и не создал полноценной самостоятельной социально-политической визии своей же жизни, в первую очередь перипетий кульминации исторического развития первой половины XX века — Второй мировой войны, когда решалась судьба белорусского народа. Не было и белорусоцентричных научных исследований. Фрагменты, из которых можно было взрастить фундаментальный труд, если и выходили на Западе, то оставались малодоступны. Да и по разным причинам ростки тех исследований так и не взошли. А актуальность темы событий относительно территории Беларуси все острее заявляла о себе, особенно с учетом популистского использования исторической драмы нации сегодняшним руководством страны. И эта работа наконец выполнена, по крайней мере заложен фундамент. Авторство ее принадлежит не официальным многочисленным научным структурам, как должно было быть в современном цивилизованном контексте, а непрофессиональному ученому-историку, в недавнем прошлом военному — Александру Татаренко. Автор не является сторонником какого-либо политического направления, сотрудником научного заведения или последователем исторической школы, то есть, несмотря на определенные недостатки (у кого даже из профи их нет?), он в минимальной степени подвержен влияниям из вне. Причем, стремясь сделать исследование доступным наиболее широкому кругу читателей, автор пошел по пути создания научно-популярной работы, что, с одной стороны, обеспечило высокую степень аргументированности и достоверности как аналитики, так и выводов, а с другой — позволило с интересом открыть (и в буквальном, и в переносном смысле) историю того, что происходило с белорусским народом и его землей в обозначенный автором период. Ведь очень важно, что исследование проводилось исходя из белорусоцентрических позиций, чтобы показать urbi et orbi еще одно видение событий, к тому же видение народа, с которым те события происходили, видение, которое десятилетиями игнорировалось не только зарубежными или советскими историками, но и самим белорусским официозом, что продолжается по сей день.

Итак, в чем же суть и ценность работы? Обозначим весьма частично и тезисно, ибо сам восьмисотстраничный труд еще вызовет, несомненно, широкий резонанс, который займет десятки страниц отзывов в различных изданиях как Беларуси, так и за рубежом.

Впервые в Беларуси проведено исследование, посвященное административно-территориальной единице — Новогрудскому воеводству и его правопреемнице — Барановичской области (такой работы нет нигде — ни в странах бывшего СССР, ни в странах Европы, ни в Беларуси).

Через призму многочисленных, порой уникальных фактов и документов, которые появились за последние 15 лет (научные работы, публикации, воспоминания — советские, польские, белорусские и др., документы из архивов, впервые вводимые в научный оборот) отслеживается отношение западных белорусов (и не только) к основным политическим процессам, имевшим быть в 1921-1954 гг.

Показан репрессивный механизм советской и нацистской машины (общие подходы, особенно в „еврейском вопросе" — впервые озвучен тезис о том, что евреев вначале подвергли репрессиям большевики в 1939-1941 гг., а то, что они не успели, завершили нацисты и советские партизаны).

Отражено отношение местного населения к очередным „освободителям": советам, нацистам, полякам (АК) и опять советам.

Исследованы различные формы сопротивления — АК, белорусское национальное, еврейское. Этапы его зарождения и развития, отношение к нему и участие в нем местного населения.

Особое внимание уделено белорусскому национальному сопротивлению московским „миротворцам" на всех его этапах:

1. 1939-1941;
2. 1941-1944;
3. 1944-1956.

Всесторонне и объективно раскрыт механизм советской репрессивной машины на территории оккупированной области (партизанские Особые отделы, комендатуры, расстрельные команды...).

Рассмотрены экономические преобразования „освободителей" на всех этапах существования Барановичской области.

Автор смело вступает в научную полемику со многими советскими и современными отечественными историками, утверждающими, что 17 сентября 1939 г. для населения западных областей — „освободительный поход". Для А. Татаренко не являются непреложными также авторитетами и зарубежные исследователи.

На основании веских доказательств делается вывод о том, что первыми на территории области на борьбу с гитлеровскими захватчиками встали не отряды советского Сопротивления (советские партизаны),

а граждане еврейской национальности, истинная роль которых в партизанском движении историография приуменьшает.

Автор, опираясь на исторический материал, делает еще один дерзкий вывод: для западных белорусов 1939-1944 гг. и последующие послевоенные годы были как тройная оккупация: польская, советская и нацистская. Многие другие обобщения также оригинальны, но после проведенного анализа им трудно отказать в праве на белорусоцентрическую позицию.

Etc. Etc.

Таким образом, книга развенчивает миф, сформированный советской исторической наукой и идеологией, в первую очередь о преимуществах советского прошлого, опыт которого сегодня применяется повсеместно, создается фактографический портрет восточных „братьев".

Следует подчеркнуть, что исследование основано на большом количестве источников, фотографий, документов, таблиц. Работа написана простым, доступным языком.

Необходимо отдать должное мужеству автора, который ничтоже сумняшася выносит на суд читателя свой по меньшей мере неординарный труд, понимая, сколько камней полетит в его огород да и в него самого. Однако он предлагает послушать в первую очередь не его голос, а язык беспощадных фактов, цифр, аналитики. Имеющий уши да услышит...

Анатоль Трофимчик
(Барановичи)

Сяргей Пясецкі, *Запіскі афіцэра Чырвонай Арміі (ад 17 верасня 1939 г.)*, пераклад з польскай, Мінск: „VivaFutura”, 2005, 252 с.

Урэшце й беларускі чытач можа азнаёміцца з адносна скандальным раманам нашага земляка зь Ляхавіч Сяргея Пясецкага „Запіскі афіцэра Чырвонай Арміі”, які ўбачыў сьвет у 1948 г. і быў з тых пор перакладзены на шмат моваў. Твор у сацыялістычным *лагеры* быў забаронены й нават у Польшчы, ужо постсавецкай, апублікаваны толькі ў 2000 г. Прачытаўшы анатацыю на форзацы й уступнае слова ад перакладчыка, чытач можа чакаць нечага звышэпатажнага. Аднак, трэба папярэдзіць, сёньня ў рэцыпіента будзе зусім не тая рэакцыя, якая была б 15-20 гадоў таму, — больш спакойная (гэта не датычыцца тых, хто застаўся жыць у эпосе застою ці ўвогуле ў сталінскіх часох, таму ў такім сэнсе ім можна трохі пазайзросьціць, — жартую).

Як бачна ужо з назвы, Пясецкі рэпрэзэнтуе сваё бачаньне дзёньніка малодшага лейтэнанта Міхаіла Зубава напрацягу другое сусьветнае вайны. Відавочна, аўтар ставіў на мэце ў гратэскным ракурсе высьмеяць праз аднаго тыповага афіцэра ўсю армію й нават савецкі лад. У цэлым, як прынята казаць, гэта яму ўдалося. Аднак не ўсё так гладка. Па кожнай лініі (ці гэта ўнутраны сьвет героя, ці то сацыяльны пласт) знаходзяцца свае прыкметныя недапрацоўкі, сакрамэнтальныя „але” (таму, мажліва, наступная аналітыка будзе зьнешне схэматычнаю).

Найперш — пару слоў пра пераклад, каб далей не вяртацца. Тлумач Алесь Астраўцоў перастварыў Пясецкага на наркамаўку з імкненьнем стылізаваць яго патрэбным чынам. Задумка цалкам слушная.

Тое, што гучала з вуснаў савецкага афіцэра, несумненна, павінна быць аздоблена абсцэннай лаянкай, дый трасянкі перакладчыку было не абмінуць. Тым не менш, нават наркамаўка не вытрымліваецца: у лексіцы (перапаліць замест перакурыць (с. 15), тэчка замест папка (с. 44), каляжанкі замест сяброўкі (с. 73), файная (с. 20), выштукаваў (с. 21), пекная (с. 55) etc., etc.); у марфалогіі (Савецкага саюзу, гораду ў родным склоне замест канчатка -а, с. 12), сынтаксыс (паўсюдна). Месцамі адваротны перабор: калі простамоўнасьцю надзяляюцца добра валодаючыя мовамі мясцовыя настаўніцы (яны кажуць плоцім замест плацім, дзе „а” этымалагічнае). Ці вось момант, калі герой абураецца за называньне яго панам і называе сябе „шляхотным чалавекам” (с. 25) — яўная супярэчнасьць. Перакладчыку, відавочна, трэ было арыентавацца болей на пераклад ня толькі моўны, але й соцыёкультурны, зьнітаваўшы іх. І ўвогуле стыль „пахне” пальшчызнаю, а ня „русским духом”, і гэта пры перакладзе тлумач мусіў быў нівеляваць.

Форма дзёньніка дае магчымасьць 1) не прэтэндаваць на аб'ектыўнасьць, 2) адлюстраваць аголена ўнутраны сьвет героя: яго культуру, інтэлект, жыцьцёвыя прыярытэты. Аўтапартрэт атрымаўся калярытным — гэта салдафон, які не сумняваецца ў сваёй рацыі й у тых ідэалах, носьбітам якіх сам зьяўляецца.

Увогуле тэкст падобны ўсё ж не да дзёньніка, а да адбітку думак, фрагмэнтаў, так бы мовіць, плыні сьвядомасьці. Чаму? Дзёньнік, як заўважыў неяк В. В. Розанаў, нават самы інтымны, калі й пішацца, дык са сьвядомым ці вельмі часта й падсьвядомым меркаваньнем, што яго нехта прачытае. А тут фанабэрысты савецкі афіцэр адлюстроўвае некаторыя свае думкі, якія яму яўна не карцела б вынесьці на публіку, тым больш, што „дыяруш" прысьвячаецца самому Сталіну (с. 14). А некаторыя моманты для таго афіцэра засталіся б адназначна незаўважанымі для яго самога: „Устаў я. Натуральна, сплюнуў. І выйшаў з гонарам" (с. 26). Сплюнуць у той сытуацыі для яго было, як дыхнуць паветрам, але ж аўтар пра дыханьне нам не падкрэсьлівае. Да таго ж месцамі ўкладзена ў запісы афіцэра фраза „думаю" ў тым ці іншым варыянце (с. 26), чаго ў дзёньніках, якія пішуцца постфактум, не сказаць, што зусім няма, але гэты дзеяслоў ужываецца ў прошлым часе, што, дарэчы, ёсьць і ў рамане, прычым на той самай старонцы. А некаторыя моманты савецкі афіцэр увогуле сьвядома не даверыў бы ня толькі дзёньніку, але й сваім думкам: напрыклад, пра існаваньне цэнзуры на перапіску (с. 31); ці пра інцыдэнт у цягніку, калі ён застрэліў чалавека, думаючы, што той рыхтуецца ўзарваць бомбу, як адкрываў тэрмас (с. 40-46). Бо, як справядліва сказаў маёр НКВД, „ты, ідыёт, нас высмейваеш. З-за вас, такіх дурняў, як ты, усе з нас кпяць" (с. 46). Або пра „антыдзяржаўную" размову з рабочым за бутэлькай (с. 48-54). І самае галоўнае. Думкі адносна здрады Сталіна, якія ўзьніклі ў Зубава на пачатку вайны з Германіяй, і канфармісцкая перарыентацыя на Гітлера (с. 150-152) ды — трохі пазьней — на Чэрчыля (с. 165-167) і на польскіх кіраўнікоў (с. 195-196), наўрад ці сталі б занатаванымі, а калі б такое здарылася, дык тыя запісы былі б старанна зьнішчаны. Таму называньне твора дзёньнікам досыць умоўнае, такім ён ёсьць толькі па форме выкладаньня матэрыялу, які па змесьце аніяк ня мог быць паўсядзённымі нататкамі.

Мысьленьне, як адцеміў перакладчык, у афіцэра сапраўды мэханізаванае. Іначай і быць не магло ў вінціка сыстэмы.

Але аўтар месцамі ўсё ж дае маху, надзяліўшы героя здольнасьцю да паэтычнага сьветаўспрыманьня:

„Выйшаў я на балкон. Бачны вялікі кавалак гораду, і рака таксама струмяніцца... Уздыхнуў я: цудна!.. Неба блакітнае, блакітнае, блакітнае... Вось, думаю сабе, пашыў бы я з такога блакіту для сябе кашулю, а для Дуні спадніцу" (с. 26). Куды там імажыністым!

Трапна выпісана місыянерскасьць, зь якой ішлі тыя афіцэры, несучы „культурную рэвалюцыю”, ад чаго потым пры савецкім панаваньні заходнебеларускай інтэлігенцыі млосна станавілася. Цікава, што само афіцэр’ё фанабэрліва лічыла гэта прымальным і нават выкшталцоным (ізяшчным), а сябе — больш культурнымі за мясцовых настаўнікаў. Гэта можна прасачыць і па кнізе (с. 16): герой, захацеўшы зьняць пакойчык у дзьвюх састарэлых настаўніц, думае:

„Кабеты заўсёды менш небяспечныя (але ўсё адно небясьпечныя, бо ён жа ў варожым асяродку — А. Т.). Можа, і не нападуць знянацку, не зарэжуць. Мусяць быць троху больш культурным элементам”.

Як успамінаў мой аднавясковец А. М. Чабатарэнка, дзяцінства якога прыпала на той час, да іх зайшлі худыя, у зашмальцаваных гімнасьцёрках і ледзь ні босыя савецкія салдаты з камандзірам (можа, Зубавым?), каб „перакусіць”. Пад добрую беларускую самагонку, ласуючыся салам, шырэйшым за далонь, пахучым кумпяком, пальцам пханаю каўбаскаю, што для іх было дзівам-дзіўным, камандзір з набітым ротам толькі прыгаворваў: „Мы вас вызвалім з-пад панскага прыгнёту!”

Гэта нам сёньня сьмешна ад таго, што тыя афіцэры на вечаровыя імпрэзы прыходзілі са сваімі жонкамі, апранутымі ў начныя кашулі. Такія факты зафіксаваны па ўсёй Заходняй Беларусі й арганічна пасавалі б раману. Аўтар жа занадта засяродзіў увагу толькі на ботах і гадзіньніках (апошнімі чырвоныя афіцэры ўпрыгожвалі абедзьве рукі).

Псыхалёгія афіцэра „злоўлена” аўтарам. Акрамя ўжо згаданых, адзначана такая рыса, як сквапнасьць. Верна адлюстравана атмасфэра падазронасьці — нават да сваіх саслужбоўцаў, не кажучы пра іншых, тым больш „ворагаў”. Псыхалёгія настрою на сьмерць — загінуць у імя Сталіна й сьветлай будучыні было самай вялікай марай сапраўднага савецкага грамадзяніна — зьяўлялася адным з базысных момантаў савецкае ідэалёгіі (с. 61-62). Проста й удала раскрываецца псыхалёгія рабства:

„Аднак жа і шчаслівы я быў, калі жыў у Расіі і пра ўсё тое, што цяпер ведаю, нічога не ведаў” (рэмінісцэнцыя біблійскага памнажэньня смутку празь веды). Тая псыхалёгія заключаецца й у тым, што чалавек лепей будзе жыць кепска, але лепш за іншых, чым добра, але аднолькава зь іншымі (с. 201).

„Ваш урад зусім не хоча, каб народ быў сытым і дастатак меў. Яны добра ведаюць, што сыты чалавек пачынае аб чым-небудзь іншым, акрамя ежы, разважаць. А так кожны думае толькі пра тое, каб з голаду не здохнуць і голым не хадзіць... А адначасова яму столькі гадоў убіваюць у галаву, што нідзе на свеце так добра не жывецца, як у іх” (с. 208).

Перараджэньня, якое пачало праклёўвацца ў Зубава, не адбываецца: будучы каньюнктуршчыкам па сваёй прыродзе, такім ён застаецца й надалей.

Афіцэр у дзёньніку ні слова пра службу, а толькі пра цывільнае жыцьцё ў далучаным краі. Яно зразумела — за савецкім часам усё, зьвязанае з арміяй, зьяўлялася звышсакрэтным, тым ня менш праз радкі дзёньніка не адчуваецца, што Зубаў моцна ўзалежнены службовец, бо вядзе цывільнае жыцьцё, купляе боты, катрынку, заляцаецца да паненак... Хаця тая ўзалежненасьць павінна была грунтоўней быць адлюстравана празь дзеяньні на псыхалёгіі пэрсанажа.

Што датычыцца сацыяльнага фону ў рамане, аўтар, зразумела, прапануе на яго паглядзець вачыма свайго пэрсанажа, якому пасьля параўнаньня з калгасным ладам сытуацыя менавіта такой (сьвяточнай, багатай), мусіць, і бачылася, яму не было з чым параўнаць: ён ня ведаў, як жылі да вайны. Заходнебеларуская рэчаіснасьць у Пясецкага відавочна прыфарбаваная. Сумненьні зьяўляюцца пры апісаньні паспалітага люду Вільні, прыбранага „як на баль" (с. 18): наўрад ці ў час вайны там панаваў такі спакой. Шмат гіпэрбалізацыі ў ганьбаваньні савецкага ладу й культуры пры паралельным усхваленьні ўчарашняга дня Польшчы (як ні круці, а для большасьці беларусаў — панскай), які рэхам гучаў пасьля 17 верасьня, праўда, з кожным днём цішэй ды цішэй.

Лепшых сяброў за фашысцкую Германію ў СССР тады не было, і стасункі іхнія былі сапраўды вельмі цёплыя, што можна прасачыць па афіцыйных дакумэнтах[1], сёньня лёгка даступных усім, акрамя некаторых, у тым ліку беларускіх, гісторыкаў.

Аўтар усё ж занадта акцэнтуе ўвагу на дружбе Гітлера й Сталіна. Нягледзячы на адпаведны дагавор паміж дзяржавамі, Германія ў СССР усё ж адносілася да краін капіталістычнага сьвету, хоць і са скідкай на тое, што там кіравала нацыянал-*сацыялістычная рабочая* партыя.

У рамане адлюстравана вялікая ступень варожасьці тутэйшых да новае ўлады, што мае пад сабой грунт.

Самі непасрэдныя відавочцы-„вызваліцелі" потым спаміналі: „Ну, як скозать, ослобождать ослобождали. Но этие люди нас не очинь хотили, шоб ми йих ослобождали. Але ж недовольные були, потому шо нашы зразу поставили жорстку дисциплину йим... Ночали нокладовать но йих великие нологи, начали йим... репресировать, так они уже до... неудовольствение були... Док ени нашых неновидили, богато вбивали"[2]. Ці, калі зь іншага боку, паводле паэта Сяргея Панізьніка:

Сеялі і малацілі...
Раптам нас „асвабадзілі":
на прыгон штодня прымусілі хадзіць... (Цытую па памяці.)

[1] http://around.spb.ru/variety/docs/diplomat/wwar.php

[2] Василий Каленикович Горбаченко (1912-1998), д. Машевэ (Чернобыльского района), *Говірка села Машеве Чорнобильского району*, ч. 1: Тексти. К.: Довіра, 2003, с. 21, 51.

А тое, што насельніцтва з радасьцю й надзеямі сустракала „братоў з усходу”, аўтарам абмінаецца. Максымум, што знойдзем, зьяўляюцца словы „контрыка” (на думку Зубава), а насамрэч банальнага спэкулянта Колькі:

„Маеце добрую прапаганду... Найлепшую ў свеце... Як я вашых кніжак начытаўся, фільмаў наглядзеўся, песенек аб вольнасці наслухаўся, дык нават уцячы збіраўся з Польшчы ў Расію. А як вы сюды прыйшлі, дык паглядзеў, што ў вас ёсць і якія вы самі ёсцека, дык, каб ведаў, што назаўсёды тут застанецеся, куды б заўгодна ўцёк. Нават да мурынаў у Афрыку” (с. 131-132).

Слушна й не бяз гумару вядзецца лінія імпэрыялістычнае традыцыі Расеі з даўнейшых часоў, у прыватнасьці ад Пятра I, які „на карысць пралетарыяту і камуністычнай партыі працаваў і фундамет Савецкага Саюзу будаваў” (с. 116).

Гістарычныя калізыі маглі быць трохі акуратнейшымі: аўтар паведамляе пра пачатак бамбардзіроўкі Лондана (с. 108), але ні слова не кажа пра разгром Францыі, які адбыўся крыху раней, бо насамрэч менавіта пасля яго сталі „палякі хадзіць, як прыгнечаныя. Насы паапушчалі” (108).

Не будучы знаўцам вайсковае гісторыі, магу памыляцца, але, здаецца, у Чырвонай Арміі спачатку выкарыстоўваўся тэрмін не „афіцэр”, а „камандзір”, толькі ў 1940 г. была ўведзена сыстэма воінскіх званьняў для вышэйшага камандзірскага складу, а ўжо пазьней — для астатніх.

Па-за вышэйазначанымі антыноміямі знайшлося яшчэ некалькі, думаецца, вартых для рэпрэзэнтацыі меркаваньняў.

Мастацкая каштоўнасьць многіх твораў нярэдка вызначаецца праз адну з функцый мастацтва, далёка ня першасную, але неад’емную, — касандраўскую. Валоданьне ёю — паказчык надзеленасьці твора неабыякім узроўнем, патэнцыялам. Знаходзім прадбачаньне й у Пясецкага, да таго ж у канцэптуальна важным пасажы — пра адносіны савецкае ўлады да сваіх кіраўнікоў, многія зь якіх сталіся „ворагамі народу”, „агентамі” й да т. п. Прароцтва аўтар укладвае ў вусны Колькі, які ня дужа сябруе з законам (у чым можна правесьці паралель з асобай самога Пясецкага, таму ў дадзеным выпадку, верагодна, праз мэтад „перададзенай трыбуны” (Антон Адамовіч) мы сутыкаемся непасрэдна з прагнозамі аўтара, які пісаў наступныя радкі, успомнім, у 1948 г.[3] — час росквіту сталінізму):

„Праз 20 год (было 1.01.1941 — А. Т.) у той самай кніжцы (Гісторыя УКП(б) — А. Т.) альбо ў іншым выданні будзе напісана, калі раптам Чырвоная Армія дзе-небудзь ад каго-небудзь атрымае ў знакі, дык толькі ад таго, што Сталін быў капіталістычным агентам і перашкодзіў перамозе” (с. 135).

[3] Nota bene: сінхронна з раманам-антыутопіяй Оруэла *1984*, у чым можна знайсці свой культуралагічны цымус.

Развенчваньне культу асобы пачалося нават раней, чым праз прагназаваныя 20 гадоў, а пралікі (ці, дакладней, іншыя разьлікі) Сталіна ў 1941 г. як галоўная прычына ваеннае катастрофы сёньня аспрэчваюцца хіба толькі непапраўнымі маразматыкамі, якія зусім ня *петраць* у гісторыі, але працягваюць *каваць* яе. Цікава, што й сам Пясецкі не сумняваецца ў сваім правідэнцыялізьме (с. 150).

Аднойчы давялося пачуць, хоць сам пра гэта асабіста ня думаў, такую заўвагу ад суіскальніка ступені кандыдата гістарычных навук па „непэрспэктыўнай" тэме (імя па зразумелых прычынах не паведамляю), што стыль мысьлення рускага афіцэра пераклікаецца з аратарскім мастацтвам самага галоўнага гісторыка т.зв. Вялікае Айчыннае вайны на Беларусі. Таму гэты штрых дадае важкасьці твору ў сэнсе актуальнасьці.

Твор мае велічэзнае поле для разнастайных і цікавых культуралагічных, у першую чаргу інтэртэкстуальных параўнаньняў.

Так, лісты афіцэра сваёй жонцы Дуняшцы нагадваюць пісьмы дамоў яго калегі па распаўсюджваньні пралетарскае рэвалюцыі таварыша Сухава з савецкага „вэстэрна" „Белае сонца пустыні", толькі, нягледзячы на падабенства момантаў у форме, канешне, выяўляюцца гэтыя два вобразы па-рознаму. Думаецца, калі б пра Сухава пісаў Абдула, дык ацэнка савецкага баевіка зьмянілася б са станоўчай на адмоўную, набыўшы аналёгіі з Зубавым: і тут, і там савецкі жаўнер прыходзіць на чужую зямлю з місыянерскай функцыяй, чужой тутэйшай культуры й мэнталітэту.

Міжволі хочацца правесьці паралелі стасоўна стылю з Рабле ў некаторых, але канцэптуальных, прыёмах. Хочацца, але Пясецкі не дацягвае (ды й я не Бахцін жа). А вось вобразы славянскіх жаўнераў — „нашага" Мішкі Зубава, сусьветнавядомага Швэйка й трохі меней знакамітага ў сьвеце Чонкіна — літаратуразнаўцам, думаецца, параўнаць было б цікава, да таго ж кампаратывістыка яшчэ нядаўна была ў модзе. Праз гэтыя пэрсанажы адкрываецца чытачу цэлы сьвет, дагэтуль у многім незнаёмы, часам нечаканы сваёй абсурднасьцю. Але пры падрабязным аналізе гэтыя пратаганістыя выяўляюцца незвычайнымі індывідуаламі па характары. Важнымі адрозьненьнямі Зубава зьяўляюцца 1) яго афіцэрскае званьне — гэта фармальна, 2) яго ідэйная жыцьцёвая пазыцыя — гэта фактычна. У адрозьненьне ад „маленькіх" Чонкіна й Швэйка, Зубаў даўно „выйшаў з шынэлі" — салдацкай прынамсі (дзякуючы таварышу Сталіну, што ён сам падкрэсьлівае на кожным кроку), ён робіць гісторыю, распараджаецца лёсамі „людзішак" (Швэйк жа, напрыклад, сваёй ролі „ў гісторыі новай, вялікай эпохі"[4] й блізка не ўсьведамляе).

Паколькі малодшы лейтэнант Зубаў надае большае значэньне свай-

[4] Я. Гашак, *Прыгоды бравага салдата Швейка ў сусветнай вайне*, „Крыніца", 1995, № 6, с. 97.

му дзёньніку, лічачы сябе паўнавартасным пісьменьнікам, можна глянуць на яго нататкі яшчэ з аднаго боку — як на ўзор савецкае літаратуры таго часу. Травэсьціравана, але ў дастатковай ступені раскрыты прынцыпы так званага сацыялістычнага рэалізму й партыйнасьці пэрыяду сталінізму: маўляў, „буржуйскія пісакі" „змушаны заўсёды хлусіць і выслугоўвацца перад капіталістамі", але „літаратура не выносіць прымусу, таму можа квітнець толькі там, дзе ёсць мы (камуністыя — А. Т.) і дзе апякуецца ёю БАЦЬКА СТАЛІН" (с. 76). (Зрэшты на Беларусі са стварэннем прыдзяржаўнага Саюза пісьменнікаў такая тэза зноў набывае для некаторых актуальнасьць.)

Асабістая спроба вызначыць жанрава-ідэйнае рэчышча твору прывяла да маркіраваньня яго іронарэалізмам ці фарсарэалізмам — у адрозьненьне ад проста рэалізму з аднаго боку й шызарэалізму — з другога. Што да спэцыфікі літаратурнага накірунку, яшчэ згадалася вылучэньне такой зьявы, як савецкі постмадэрнізм. Гэты ж твор (напісаны таксама на савецкіх рэаліях і нават з падабенствам некаторых мэтадаў мастацкага пісьма — у фармальным сэнсе, але зь іншай, супрацьлеглай сутнаснай напоўненасьцю), магчыма, варта было б аднесьці да антысавецкага постмадэрнізму (калі б такі існаваў). Прыкметы ж постмадэрнізму прысутнічаюць у вялікай ступені. Некалькі штрыхоў. Гульня слоў: герой надумаў набыць партрэт Сталіна, каб яго наведвальнікі бачылі яго культурнасьць: „Спытаўся я таксама пра партрэт Гітлера. Варта б іх, каханых таварышаў, разам *павесіць*" (с. 34, курсіў наш — А. Т.). Аксюмаран: „Уласна пра тое і клопат: пра культуру, вашу маць!" (с. 13). Гіпэрбалізацыя — ut supra. Параўнаньні з актуаліямі, маючымі яўна гульнявы й разам з тым ацэначны характар: „Ноч была чорнай, як сумленне фашыста, як намеры польскага пана, як палітыка англійскага міністра" (с. 11), „Зіма скончылася, так жа, як скончылася буржуйскае панаванне на Беларусі. Прыйшла вясна, так жа, як мы — салдаты Чырвонай Арміі" (с. 76). (Дарэчы, расійскі пісьменьнік-антыўтапісты Андрэй Платонаў любіў такі прыёмчык.)

Такім чынам, падсумоўваючы: ідэя — файная, увасабленьне ў сілу й аб'ектыўных (ёсьць усё ж хібы ў веданьні матэрыялу, абумоўленыя магчымасьцямі аўтара), і суб'ектыўных (рэалізацыя ідэі ў форме дзёньніка не зусім адэкватная, хоць і мае важкія плюсы) прычын кульгае. Дый пераклад, нягледзячы на пэўныя прадуманыя падыходы тлумача, мае відавочныя хібы. (Дазволю сабе яшчэ адно параўнаньне. У беларускай літаратуры былі ўжо сатырычныя запіскі — Самсона Самасуя, і па адпаведнасьці, сумяшчальнасьці формы й зьместу, па майстэрству выкананьня яны выйграюць у параўнаньні з дзёньнікам савецкага афіцэра, толькі тэма, выбраная Пясецкім, больш эфэктная.) Увогуле ж кніга вартая, каб ня толькі быць заўважанай, але й заняць сваю, дагэтуль цал-

кам пустую нішу ў беларускім літаратурным кантэксьце ці, калі вам заўгодна, дыскурсе (праўда, запаўненьне вакансіі адбудзецца не так гучна, як магло гэта быць раней).

Цікава, але ў „Запісак...” знаходзіцца й своеасаблівы працяг. Ім можна лічыць раман „Заходнікі” Г. Далідовіча (1994) — пра пасьляваеннае жыцьцё „вызваленае” беларускае зямлі, які, праўда, напісаны ў іншай манэры, але таксама мае выкрывальніцкую сутнасьць злачыннасьці савецкае ўлады. Дый свой Зубаў там знаходзіцца, пераўвасобіўшыся ў прадстаўніка ўлады Кураглядава.

Анатоль Трафімчык
(Баранавічы)

Эдмунд Ярмусик, *Католический Костёл в Беларуси в 1945-1990 годах*, Министерство образования Республики Беларусь, Учреждение образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы», Гродно 2006, 568 с.

Kościół katolicki na Białorusi w XX wieku funkcjonował w wyjątkowo trudnych i przez wiele dziesięcioleci niezwykle złożonych uwarunkowaniach. Zmieniająca się przynależność państwowa tych ziem, ciężkie walki podczas dwóch wojen światowych, inne konflikty zbrojne i silna presja ideologiczna w warunkach działania państwa radzieckiego w sposób wydatny zmniejszały możliwości nie tylko oddziaływania duszpasterskiego, ale również praktycznie w wielu przypadkach pozbawiały szans uczestnictwa w zorganizowanych formach życia religijnego. Można tu przytoczyć chociażby dane statystyczne z których wynika, iż z 328 kościołów funkcjonujących do II wojny światowej na terenach ówczesnego państwa polskiego, w latach 80. zostało niespełna 100. Ten niesprzyjający okres dziejowy cały czas jeszcze nie w pełni jest zbadany i udokumentowany. Nie zachowano wielu dokumentów źródłowych, brak już jest wielu świadków wydarzeń. Ze względów bezpieczeństwa w przeszłości ukrywano także zakres funkcjonowania życia religijnego i z tego powodu nie przechowywano materialnych śladów tej aktywności.

Religia w Związku Socjalistycznych Republik Radzieckich była traktowana zgodnie z wytycznymi doktryny marksistowsko-leninowskiej, jako „opium dla ludu". Zarówno duchowni, jak i wierzący zostali poddani licznym represjom. W sposób szczególny dotyczyło to właśnie Kościoła katolickiego. Był on bowiem odbierany nie tylko jako wyznanie, ale instytucja, która podlega stolicy apostolskiej w Watykanie i posiadała charakter wydatnie polski, a przez co wrogi klasowo. W tych trudnych czasach Kościół mógł liczyć tylko na własne siły, a pomoc z zagranicy, w wyniku nadzoru organów bezpieczeństwa, była mniej niż symboliczna. Problematyka religii była poruszana w wielu publikacjach radzieckich, nie dokumentowały one jednak życia ludzi wierzących. W radzieckiej Białorusi ukazało się blisko 900 wydawnictw książkowych. Miały one bardzo pejoratywny wydźwięk i można je niewątpliwie zakwalifikować do kategorii środków oddziaływania ideologicznego. Jednocześnie wydawnictwa, które były wydawane na ten temat w krajach zachodnich opierały się na bardzo wąskiej bazie źródłowej, a ich podstawą były relacje uczestników zdarzeń.

Sytuacja pod tym względem uległa radykalnej zmianie w latach 90. Nie było już wtedy ograniczeń administracyjnych, a ośrodki badawcze i wydaw-

nicze uzyskały pełną swobodę działalności. Wielu naukowców, zwłaszcza z Polski, podjęło wówczas trud udokumentowania losów Kościoła w ZSRR. Szczególne osiągnięcia w tym zakresie posiada ks. Roman Dzwonkowski SAC. Należy jednak wymienić też m.in. Adama Hlebowicza, Zdzisława J. Winnickiego, Iwonę Kabzińską, ks. Edwarda Walewandra, Krzysztofa Renika. Odczuwalny był jednocześnie niedobór prac uczonych białoruskich. Pojawiały się pewne publikacje, ale tematyka ta oczekiwała szerszego przeanalizowania. Niewątpliwie wspomnieć należy pracę ks. Władysława M. Zawalniuka, Władimira I. Nowickiego, Jeleny N. Fiłatowej, Walentyny W. Grigoriewej „Konfesje na Białorusi (koniec XVIII-XX w.)", Mińsk 1998. Brak było jednakże odpowiedniego całościowego ujęcia, które odnosiłoby się wyłącznie do Kościoła katolickiego.

Częściowo wyjściem naprzeciw temu zapotrzebowaniu jest książka Edwarda Jarmusika „Католический Костёл в Беларуси в 1945-1990 годах" (dalej „Kościół katolicki na Białorusi w latach 1945-1990"). Autor jest docentem w Katedrze Historii Białorusi Grodzieńskiego Państwowego Uniwersytetu im. Janki Kupały. Kwestie katolicyzmu są mu bliskie od dawna i problematyce tej poświęcił już wiele publikacji. Należałoby tu zwrócić zwłaszcza uwagę na „Kościół katolicki w latach II wojny światowej (1939-1945)", Grodno 2003. Niejako więc jej kontynuacją jest recenzowana pozycja. Nie odnosi się ona co prawda do całej XX-wiecznej historii Białorusi, ale autor wybrał okres najbardziej jednorodny. W 1945 r. ustabilizowały się granice Białorusi, zakończone zostały działania wojenne na dużą skalę, a władze radzieckie w sposób zdecydowany przystąpiły do realizacji polityki ateizacyjnej, która z różnymi modyfikacjami trwała do końca lat 80.

